*Доўнар JI.L (Мінск)*

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ КНІГІ Ў БЕЛАРУСІ: ДА ПЫТАННЯ АБ РЭГІЯНАЛЬНЫМ КНІГАЗНАЎСТВЕ

*Основное внимание уделяется обзору состояния исследований в области регионального книговедения Беларуси в 1985—2010 гг., в которых предметом исследований выступает тот или иной регион. Зарождение и развитие региональных книговедческих исследований отмечается с XIX - начала XX в. Рассматриваются направления и аспекты, тематика исследований, ведущие центры и их издания, отдельные монографии и публикации, на основе которых выявляются тенденции, а также проблемы и перспективы развития регионального изучения истории книги в Беларуси.*

Рэгіянальныя даследаванні гісторыі кнігі ў Беларусі не з'яўляліся прадметам асобнага вывучэння ў беларускім кнігазнаўстве, хоць, як вядома, рэгіянальны, лакальны падыход, які выкарыстоўваецца ў тых ці іншых беларускіх гістарычных кніжных даследаваннях, з'яўляецца адным з перспектыўных, бо дазваляе глыбей і ва ўсёй разнастайнасці адлюстраваць асаблівасці гісторыі кнігі і кніжнай культуры цалкам Беларусі. Пашырэнне падобных даследаванняў спрыяла б далейшай распрацоўцы агульных пытанняў па рэгіянальным кнігазнаўстве, а таксама, у прыватнасці, і тэрміналагічных, напрыклад такіх як «край» і «рэгіён»[1], «рэгіянальнае» і «нацыянальнае» [10], вызначэнню іх суаадносін і прыдатнасці да прымянення ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве. Пецярбургская даследчыца А.Н. Маслава прапануе разглядаць краязнаўчую бібліяграфію, напрыклад, у якасці прыватнага выпадку, адгалінавання рэгіянальнай бібліяграфіі [12, с. 208]. Яе падыход таксама адпавядае нашаму меркаванню наконт вызначэння тэрмінаў «рэгіянальны» і «краязнаўчы», якія адлюстроўваюць не суадносіны тэрытарыяльных адзінак (якія могуць і супадаць), а пэўныя якасныя ўласцівасці. Трэба адзначыць, што сёння актыўна развіваецца рэгіянальнае кнігазнаўства, напрыклад, у Расіі [26] і Польшчы [27], распрацоўваюцца як гістарычныя, так і тэарэтычныя пытанні.

---

[1] Рэгіён ад лацінскага regio, што азначае «краіна, вобласць». Гістарычна Region - назва горада, заснаванага грэкамі ў паўднёвай Італіі, вядомага як Regio ў часы Рымскай імперыі. Сучасная назва Рэджые-ды-Калабрыя. Рэгіён - буйная тэрытарыяльная адзінка (напрыклад, прыродная, эканаміч- ная, палітычная, культурна-гістарычная і г. д.), якая вызначаецца цэлас- насцю і ўзаемасувяззю яе элементаў. Рэгіянальны - той, які адносіцца да нейкай пэўнай тэрыторыі (раёна, вобласці. краіны, групы краін). Гл.: http://be-x-old.wikipedia.org/wiki. 

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Беларусі ёсць таксама вынікі ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства [21].

У дадзеным артыкуле робіцца спроба вызначэння пэўных прац, якія адносяцца да рэгіянальнага кнігазнаўства ў Беларусі, а менавіта пад увагу бяруцца даследаванні, прысвечаныя тым ці іншым рэгёнам[2], адзначаюцца цэнтры па даследаванні кнігазнаўчых пытанняў у рэгёнах, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі і праблемы ў галіне рэгіянальных даследаванняў гісторыі кнігі і кніжнай культуры.

Некаторыя аспекты рэгіянальнай гісторыі кніжнай справы былі актуалізаваны яшчэ ў XIX - пачатку XX ст. у працах краязнаўчага і бібліяграфічнага характару (напрыклад, Аляксандра Ельскага, Аляксея Сапунова, Зінаіды Пенкінай). У значнай ступені ў гісторыка-культурных і літаратуразнаўчых даследаваннях яны адзначаюцца ў перыяд беларускага адраджэння ў першым дваццацігоддзі XX ст. Спецыяльныя публікацыі, прысвечаныя непасрэдна гісторыі кнігі ў пэўным рэгёне, з'яўляюцца ў Беларусі ў канцы 1950-х гг. Да іх адносіцца артыкул Сендэра Палееса «З гісторыі друкарскай справы ў Мінску» ў часопісе «Беларусь» (1957, № 9) пра кнігадрукаванне ў Мінску з канца XVIII і да сярэдзіны XIX ст.

У 1960-70-я гг. рэгіянальны гісторыка-кнігазнаўчы кірунак атрымаў некаторае развіццё ў працах Аркадзія Падліпскага (па гісторыі бібліятэк і кнігавыдання ў Віцебску [19], Валянціны Цыбулі [25] і Сямёна Ашаровіча [18] (па гісторыі кнігазбораў у Мінску. Сярод літаратуразнаўчых і гістарычных даследаванняў 1970-80-х гг., у якіх гісторыя кнігі атрымлівае асвятленне ў сацыякулыурным кантэксце тых ці іншых рэгёнаў, - напрыклад, манаграфія Рыгора Семашкевіча «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX - пачатак XX ст.)» (Мінск, 1971), артыкул Анатоля Грыцкевіча «Книжное дело в феодальном Слуцке в XVI-XVIII вв.» і раздзел у манаграфіі [3] і інш. На пачатку 1980-х гг. вылучаюцца даследаванні гісторыі кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску [11], у пачатку 1990-х гг. - Гродне [24].

З аднаго боку, характэрная тэндэнцыя развіцця беларускага кнігазнаўства - уключэнне яго гістарычных пытанняў у агульную праблематыку гуманітарных навук, што адбілася і на слаба развітым рэгіянальным аспекце вывучэння гісторыі кнігі, асобныя пытанні якога разглядаліся на ўзроўні мясцовага перыядычнага друку ці ў даведачна-энцыклапедычных выданнях у межах артыкулаў аб дадзеным рэгёне і мелі ў большасці аглядны характар, хоць, у сваю чаргу, стымулявалі і прадвызначалі перспектывы ў тым ліку і рэгіянальных кнігазнаўчых даследаванняў. З другога боку, беларускай навуцы спатрэбілася больш часу

[2] Пад рэгёнам разумеецца адзінка любога тэрытарыяльнага ўзроўню.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(у сілу розных палітычных, гістарычных і культурных прычын) для ўсведамлення і крышталізацыі ролі, значэння, асаблівага і агульнага ў развіцці лакальных культурна- гістарычных тыпаў, што стала найбольш відавочным ў даследаваннях і публікацыях з канца 1980-х - пачатку 1990-х гг.

Так, на хвалі актывізацыі працэсу пераасэнсавання сістэмы каштоўнасцей, узрасла цікавасць да кнігі мінулых гадоў як да помніка матэрыяльнай, мастацкай і духоўнай культуры, што, у сваю чаргу, садзейнічала павелічэнню колькаснага і якаснага складу гісторыка-тэарэтычных даследаванняў па кніжнай культуры Беларусі. Новай з'явай у гісторыі кніжнай культуры Беларусі стаў першы (праўда, і адзіны) выпуск альманаха бібліяфілаў «Свитязь = Свіцязь» (Мінск, 1989) на беларускай і рускай мовах, выдадзены Таварыствам аматараў кнігі БССР, у якім знайшлі адлюстраванне і некалькі рэгіянальных кнігазнаўчых тэм Н. Ракіцкай, В. Цыбулі, З. Ільеўскага, А. Падліпскага, Ф. Шкляра і інш.

Безумоўна, важнейшую ролю адыгралі і такія навуковыя і грамадскія цэнтры, як Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, створаныя ў 1991 г., якія праводзілі міжнародныя канферэнцыі, выпускалі навуковыя выданні гісторыка-культуралагічнага характару, сярод якіх адметную ролю па прыцягненні навуковых кадраў да распрацоўкі востра запатрабаваных агульнатэарэтычных і гісторыка-культуралагічных навуковых пытанняў, што мелі значны ўплыў і на кнігазнаўства, адыграла «Беларусіка = Albaruthenica» (з 1993 па 2010 г. выйшла 29 кніг, у асноўным пад рэдакцыяй Адама Мальдзіса). Былі апублікаваны і *тэматычныя зборнікі* «Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры» (1994, кн. 3), «480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў» (1998, кн. 9.), «Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства» (2001, кн. 20).

Адным з першых крокаў па распрацоўцы комплексных даследаванняў рэгіянальнай кніжнай культуры было і абвяшчэнне Міжнароднай славяназнаўчай праграмы «История книжной культуры Подляшья», прадстаўленай Юрыем Лабынцавым у 1992 г. на Міжнароднай царкоўна-навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю праваслаўнай царквы на Беларусі (сумесны праект Расійскай акадэміі навук і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі). Прапаноўваліся як тэарэтычныя даследаванні, так і стварэнне шматтомнага энцыклапедычнага выдання, «включающего в себя практически полную информацию обо всех сторонах культурного процесса на Подляшье, связанного с рукописной и печатной книжностью на церковнославянском, древнерусском, старобелорусском, староукраинском, белорусском, украинском, русском, польском, латинском и литовском языках» [9]. У выніку даследаванняў іх аўтарамі - Ю. Лабынцавым і Л. Шча-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вінскай - былі апублікаваны і манаграфічныя працы, прысвечаныя кніжнай культуры Падляшша [22].

На пачатку 1990-х гг. ролю рэгіянальных цэнтараў, што канцэнтравалі даследаванні на мясцовым узроўні, выконвалі краязнаўчыя выданні, да прыкладу «Краязнаўчыя запіскі» (з 1992 г.) - выданне Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея; «Магілёўская даўніна» (з 1994 г.) - выданне Магілёўскага гарадскога савета, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Музея гісторыі Магілёва; «Віцебскі сшытак» (гістарычны навукова-папулярны часопіс, выдаваўся ў 1995-2000 гг. Віцебскім абласным краязнаўчым музеем, Віцебскім абласным краязнаўчым аб'яднаннем) і інш.

З 1995 г. аддзел рукапісаў, старадрукаваных выданняў і рэдкіх кніг Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пачаў выпуск навуковага зборніка «Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі», а з 1998 г. - правядзенне Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў (публікацыю матэрыялаў чытанняў), што таксама неабходна адзначыць у напрамку не толькі як дадатныя зрухі ў галіне беларускага кнігазнаўства наогул і вывучэнні гісторыі кнігі ў рэгіянальным аспекце, але і ў прыцягненні да даследаванняў рэгіянальных цэнтраў, у першую чаргу, бібліятэк і музеяў з фондамі рэдкіх кніг - гэта Гродзенскі дзяржаўны гісторыка- археалагічны музей, Гомельскі абласны краязнаўчы музей, Полацкі музей беларускага кнігадрукавання, Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей, Веткаўскі музей народнай творчасці і інш.

Найбольш абагульняльны рэгіянальны характар маюць артыкулы «Книжная культура Ветки» [8, с. 51-57] Святланы Лявонцьевай, «Книжная культура белорусов бельской земли в XVIII в.» [13, с. 76- 92], «Современная народная книжность Подляшья и Полесья» [7, с. 155-166] Юрыя Лабынцава, Ларысы Шчавінскай, «Слонім у гісторыі кніжнай культуры Вялікага княства Літоўскага XVIII ст.: кнігавыданне і кнігазборы» [6, с. 40-47], «Выданні пінскіх езуітаў (XVIII ст.)» [13. с. 229-235] Таццяны Рошчынай, «Гродненские издания XVIII в.» [6, с. 32-40] Галіны Кірэевай, «Библиотеки Гомеля» [14, с. 112-116] Ганны Кузьміч, «Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.)» [7, с. 228-236] Валянціны Саітавай, «Мінскія кнігазборы XIX ст.» [8, с. 60-72] ЛарысыДоўнар і інш.

Калі з сярэдзіны 1990-х гг. адзначалася цэнтралізацыя і актывізацыя кнігазнаўчых даследаванняў у сталіцы Беларусі, то ў апошні час, асабліва пасля 2005 г., вылучыўся відавочны рэгіянальны кірунак, у аснове якога комплексны падыход да вывучэння гісторыі кніжнай культуры рэгіёна. Яскравым прыкладам з'уляецца праведзеная Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага ў 2008 г. міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» [1]. Упершыню ў рэгіянальным кнігазнаўстве Беларусі кніга была комплексна прадстаўлена ў рэтраспектыве стварэння, бытавання. распаўсюджання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захавання; у кантэксце гісторыі і культуры рэгіёна, тэрыторыі, «дзе славянскія культуры Захаду, Поўдня і Ўсходу, роўна як заходнеўрапейскія, прыходзілі ў непасрэднае, самае цеснае ўзаемадзеянне на працягу многіх стагоддзяў. Кніжнасць і літаратура сталі найбольш універсальнымі сродкамі ўзаемапранікнення, узаемаўзбагачэння, пазнання адзін аднаго» [I.e. 5].

Арганізатары і ўдзельнікі канферэнцыі ў якасці перспектыўных навуковых даследаванняў і практычнай бібліяграфічнай дзейнасці па рэгіянальнай праграме «Берасцейскія кнігазборы» (частка праграм «Памяць Беларусі» і «Памяць свету» ЮНЕСКА), прапаноўваючы сістэматычнае правядзенне падобных канферэнцый, выдзяляюць наступныя кірункі працы: пошук і апісанне рукапіснай прадукцыі; улік усіх захаваных экзэмпляраў брэсцкіх друкарняў XVI-XVII1 стст.; рэканструкцыя рэпертуару друкарняў Брэстчыны XIX-XX стст.; гістарычную рэканструкцыю бібліятэчных збораў (прыватных, царкоўных, манастырскіх, дзяржаўных, грамадскіх); даследаванне асобных кніжных помнікаў незалежна ад іх паходжання і сённяшняга месцазнаходжання; вывучэнне звязанай з кніжнай культурай «біяграфікі» - лёсаў пісцоў, друкароў, аўтараў і ўладальнікаў (чытачоў) кніг як даўні, так і ў новы час [1].

Сёлета, 14-15 красавіка 2011 г., Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя У.І. Леніна ў рамках Румянцаўскіх чытанняў арганізавала круглы стол «Кніга Беларусі: дзяржаўныя і прыватныя калекцыі. Сучасны погляд», які быў скіраваны на абмен вопытам па фарміраванні кніжных калекцый, іх захаванні, вывучэнні і папулярызацыі. На думку ўдзельнікаў пасяджэння, неабходна распрацоўка рэгіянальнай праграмы па кніжнай культуры Гомельшчыны, «усиление координации и кооперации между республиканскими и региональными библиотеками разных ведомств в области краеведения»[3], што цалкам паслужыць развіццю як кнігазнаўства, так і краязнаўства ў Беларусі. Пажадана было б, каб матэрыялы выступленняў на падобных рэгіянальных мерапрыемствах з'яўляліся ў друку.

Пэўны ўклад у развіццё міждысцыплінарных сувязяў з гісторыяй кнігі спрабуюць рабіць у рэгіёнах і некаторыя ВНУ - гэта Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (гісторыка-краязнаўчая і гісторыка-архіўная галіна даследаванняў[4]); Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (правядзенне навуковых канферэнцый і выданне манаграфій

---

[1] Гл., напрыклад: http://www.palacegomel.by/index.php7newsicH648.
[4] Скарынаўскія чытанні, Міжнародныя Доўнараўскія чытанні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-рэлігіязнаўчых, крыніцазнаўчых і культуралагічных[5]); Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (філалагічна-палеаграфічныя даследаванні) [17]. Аднак не заўсёды, а нават часцей рэгіянальны аспект не з'яўляецца прыярытэтным у дадзеных працах.

Звяртаючыся да пытання абагульняльных манаграфій ці асобных выданняў па гісторыі кнігі і кніжнай справы, кніжнай культуры якога-небудзь з рэгіёнаў Беларусі, трэба адзначыць, што, на жаль, да гэтага часу мы маем толькі зусім нязначныя вынікі. Сярод іх - навукова- папулярныя выданні «Книга в Витебске (Книгоиздательство, библиотеки и книголюбы Витебска). Дооктябрьский период» (Віцебск, 1999)[6] Аркадзія Падліпскага, «Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне» (Варшава, 2002) [20] Алеся Пяткевіча; навуковыя працы «Prywatne ksi^gozbiory па Grodzienszczyznie w pierwszej polowie XIX wieku» Лілії Коўкель, што выйшла ў Кракаве ў 2005 г., у якой упершыню прыватныя бібліятэкі пэўнага рэгіёна Беларусі атрымалі грунтоўнае асвятленне. Аўтарам выкарыстаны дакументы з архіўных, бібліятэчных і музейных фондаў Гродна, Мінска, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Кракава і Торуні, выяўлены і прааналізаваны інвентары і каталогі прыватных калекцый. Застаецца толькі выказаць шкадаванне, што праца не на беларускай мове.

Праз польскае пасрэдніцтва беларуская рэгіянальная кніжная культура папоўнілася даследаваннямі «Ksi^zka bialoruska w II Rzeczypospolitej, 1921-1939» (Варшава, 2000) Юрыя Туронка (перакладзена на беларускую мову) [23]; «Polskie zycie literackie w Minsku w XIX i na poczqtku XX wieku (do roku 1921)» (Ольштын, 1997) Тадэвуша Зяbuilding Зянькевіча [29]; «Nigdy od ciebie miasto... Dzieje kultury wileriskiej lat miedzypowstaniowych (1832-1863) (Ольштын, 1987) Малгажаты Стользман [28] і інш.

Рэгіянальны падыход быў выкарыстаны і ў дысертацыйным даследаванні «Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795- 1917)» (Мінск, 2005) Ларысы Доўнар [5]. Аўтар таксама мае публікацыі, прысвечаныя разнастайным аспектам кніжнай культуры Мінска: кнігазборам, кнігараспаўсюджанню, мастацтву афармлення кніжных выданняў, гісторыі перыядычнага друку, кніжным сувязям у кантэксце дадзенай эпохі - канца XVIII - пачатку XX ст.

---

[5] «Наш радавод» (1997); *Марозава С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультур- ным развіцці Беларусі (1596-1839 гады) / С. В. Марозава ; пад навук. рэд. У. М. Конана.- Гродна : ГрДУ, 2001.-С. 87-119.

[6] Выданне выпушчана пры падтрымцы Віцебскай абласной бібліятэкі і Віцебскага краязнаўчага фонду імя А. Сапунова.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы некаторыя папярэднія вынікі, неабходна адзначыць, што даследаванне гісторыі кнігі Беларусі ў рэгіянальным аспекце выяўляецца ў наступных кірунках: лакальна-рэгіянальным (Мінск, Віцебск, Полацк, Гродна, Гомель, Магілёў, Слонім, Слуцк, Пінск і інш.), этнаграфічна-рэгіянальным (Падляшша, Палессе, Віленшчына, Ветка), гістарычна-рэгіянальным (Заходняя Беларусь), адміністрацыйна-рэгіянальным (Брэстчына, Гродзеншчына, Гомельшчына).

Наперадзе яшчэ працы як агульна тэарэтычныя, так і па асобных кніжных цэнтрах, якія паспрыяюць развіццю рэгіянальнага кніга- знаўства Беларусі. Вывучэнне кнігі як з'явы культуры, а значыць кніжнай культуры, будзе мець добрыя перспектывы, калі праводзіць яго з улікам таго, што кніга «...возникает, потребляется и передается в порядке культурной преемственности, в контексте не только этнического, но также и локального и регионального своеобразия той или иной социальной формации» [16, с. 12-13]. Як слушна пісаў А. Мыль- нікаў, прапаноўваючы выкарыстанне сістэмна-рэгіянальнага падыхо- ду, які склаўся ў гісторыка-культурных даследаваннях, гэта патрабуе сукупнага разгляду грамадскіх, гнасеалагічных і асобасных фактараў, што забяспечваюць узнікненне сістэмнага адзінства катэгорый культуры, якія даследуюцца, і разгляду іх як сістэмы ў межах пэўнага рэгіёна, што. у сваю чаргу, прадвызначае храналагічны і прасторавы зрэз з'явы культуры, якая аналізуецца (яго аналіз у маштабе асобнага рэгіёна ў пэўную эпоху ў межах краіны ці групы краін) [16], а сёння і з улікам распрацовак у галіне кніжнай культуры, што ўжо існуюць, напрыклад, К. Міганя [15], М. Нікалаева [2], Ю. Лабынцава [9], Л. Доўнар і Т. Самайлюк [4] і інш.

Нешматлікасць ці адсутнасць у Беларусі абагульняльных прац з пэўным рэгіянальным ахопам можна патлумачыць, у першую чаргу, складанасцю метадалогіі даследавання, якая патрабуе міждысцыплі- нарнага, кампаратыўнага падыходу, выкарыстання сучасных тэарэ- тычных дасягненняў у галіне культуралогіі, гісторыі, філалогіі, кнігазнаўства (у іх ліку - рэгіянальнага кнігазнаўства), а таксама павінна грунтавацца на добра распрацаванай бібліяграфіі рэпертуар- на-рэтраспектыўнага і рэгіянальнага тыпаў. Адначасова рэгіянальныя даследаванні кнігі і кніжнай культуры, заснаваныя на мясцовым матэрыяле. узбагацяць цалкам карціну навуковых прац у вызначаных галінах, паспрыяюць высвятленню асаблівага, разнастайнага і агуль- нагаў гісторыка-культурным развіцці Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Берасценскія** кнігазборы : матэрыялы міжнароднай навукова-прак- тычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Брэст, 30-31 кастрычніка 2008 г.) / УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» ; склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька; [пад агул. рэд. М. В. Нікалаева]. - Брэст : Паліграфіка, 2010. - С. 5-8.

2. **Гісторыя** беларускай кнігі : у 2 т. / пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2009. - Т. 1 : Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. - 2009. - 423 с.

3. **Грмцкевнч,** А. **П.** Книжное дело в феодальном Слуцке в XVI- XVIII вв. / А. П. Грпцкевич // Вопросы библиографоведения и библиотековедения : межведомственный сборник. - Минск, 1983. - Вып. 4 ; **Грицкевич,** А. **П.** Социальная борьба горожан Белоруссии в XVI-XVIII вв. / А. П. Грицкевич. - Минск : Наука и техника, 1979. - 152 с.

4. **Довнар,** Л. **И.** Книжная культура Беларуси: концептуальные основы и пути реализации научного проекта Белорусского государственного университета культуры и искусств / Л. И. Довнар, Т. А. Самойлюк // Книга - источник культуры. Проблемы и методы исследования : материалы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ